ГАЛОЎНАЕ УПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ
МІНСКАГА АБЛВЫКАНКАМА
УПРАЎЛЕННЕ ПА АДУКАЦЫІ, СПОРТУ І ТУРЫЗМУ
ВІЛЕЙСКАГА РАЙВЫКАНКАМА

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Вілейская гімназія № 2»

**Рэспубліканскі конкурс-турнір
“Дзівосы края майго’’
у рамках рэспубліканскага грамадзянска-патрыятычнага праекта**

**“Збяры Беларусь у сваім сэрцы’’**

Аўтар:
Рагун Алёна Уладзіміраўна,
вучаніца 11 класа
Кіраўнік:
Арловіч Ірына Уладзіміраўна,
настаўнік гісторыі
і грамадазнаўства
Дзяржаўнай установы адукацыі
«Вілейская гімназія № 2»
Мінская вобласць, г. Вілейка,
вул. Чапаева, 65, 222416
тэл. (801771) 32858

ВІЛЕЙКА, 2024

# ‘’Вяртанне…Страчаная спадчына Вілейскай зямлі’’

# ТОП-9

**МАТЭРЫЯЛЬНАЯ СПАДЧЫНА**

- **ПАЛАЦ АГІНСКІХ**
- **ЦАРКВА СВЯТА-МІКАЛАЕЎСКАЯ**
- **МАЁНТАК БАГДАНАВА**

**НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЯ СПАДЧЫНА**

- **РОСПІС НА ШКЛЕ**
- **ЛЕГЕНДА ПРА ВІЛЬЯНУ**
- **МАЛЯВАНЫЯ ДЫВАНЫ**

**ВЫДАТНЫЯ АСОБЫ**

- **С. ГАНЧАР**
- **Л. АЛЬПЯРОВІЧ**
- **Э. ЖАЛІГОЎСКІ**

Наша краіна мае багатую і гераічную гісторыю. Шмат значных падзей адбылося на яе тэрыторыі, якія уплывалі і на сусветныя. Трэба аднзначыць, што не меньш значную ролю ў існаванні дзяржавы адыгралі і выбітныя асобы. Час няўмольны. Многае сціраецца з памяці людзей, але многае і застаецца: падзеі, факты, асобы. За працяглы час існавання беларусы страцілі некаторую частку сваёй духоўнай і матэрыяльнай спадчыны. Але прайшоў час і многія факты сталі вядомы, з небыцця вярнуліся імёны. Старонкі гісторыі адкрываюць і сёння новае і невядомае…

У сваёй працы я звяртаюся да страчанай спадчыны маёй малой радзімы – Вілейшчыны. Гэты дзівосны куточак Беларусі яшчэ захоўвае ні адну таямніцу. Хочацца падзяліцца з усімі, хто цікавіцца гісторыяй сваім даследаваннем. Запрашаю ў пазнавальнае падарожжа па Вілейскай зямлі ў пошуках страчанай спадчыны.



**ТУРЫСТЫЧНЫ МАРШРУТ ‘’ПА СЛЯДАХ СТРАЧАНАЙ СПАДЧЫНЫ ВІЛЕЙСКАГА КРАЯ’’**

1. **Палац Агінскіх(в. Ганута)**
2. **Свята-Мікалаеўская царква(г.Вілейка)**
3. **Радзіма мастака Л.Альпяровіча(в.Куранец)**
4. **Маёнтак Багданава(в.Багданава)**
5. **Радзіма паэта-дэмакрата Э.Жалігоўскага(в.Карэкаўцы)**
6. **Прыватны музей С.Ганчара(в.Рабунь)**

## МАТЭРЫЯЛЬНАЯ СПАДЧЫНА

### Маёнтак Ручыца - Ганута

Сядзіба Ганута вядомая з 1501 года, калі належыла князям Гальшанскім. Гаспадары маёнтка змяняліся даволі часта, мяркуючы толькі па дакументах, з 1501 па 1599 год правы на Гануту пераходзілі і да Пацаў, Осцікаў, Садоўскіх, Сангушак, Славенскіх, Зяновічаў і іншых шляхецкіх радоў. Ў 1738 годзе маёнткі Ганута і Маладзечна былі запісаны Тадэвушу Францішку Агінскаму, які з’яўляўся сенатарам і кашталянам троцкім і вядомым мецэнатам.

Яшчэ ў 1755 годзе Тадэвуш Агінскі запрашае ў Гануту з Вільні знакамітага італьянскага архітэктара Абрахама Гену, які са сваімі памочнікамі за дзесяць гадоў пабудаваў тут вельмі ўдалую сядзібна-паркавую рэзідэнцыю ў стылі позняга барока з выкарыстаннем форм ракако. Сядзіба ўзводзілася па праекту архітэктара Тамаша Жаброўскага, вядомага астранома, прафесара Віленскага універсітэта, што таксама пэўны час выкладаў у Полацкім калегіуме і звычайна працаваў разам з А. Гену.



З 1801 года Міхал Клеафас Агінскі пражывае ў маёнтку Залессе, а праз трынаццаць год да яго пераходзіць і Ганута, што выкарыстоўвалася ім як летняя рэзідэнцыя, у якой пэўны час знакаміты кампазітар нават жыў. Пасля ад’езду з Беларусі Міхала Клеафаса Агінскага з 1823 года некаторы час ганукі маёнтак пуставаў. Затым перайшоў да Ржэвуцкіх.

У 1890 годзе на мясцовых могілках у Ганупе была пабудавана драўляная капліца, якая з’яўлялася помнікам народнага дойлідства мінулага стагоддзя. У 1891 годзе ў Ганупе была адчынена і царкоўна-прыхадская жаночая школа для 70 дзяўчынк. Тут дзейнічала таксама школа пісьменнасці і мясцовае двухкласнае народнае вучылішча. У 1912-1913 гадах у ім настаўнічаў Рыгор Шырма, будучы арганізатар Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы і народны артыст СССР.

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў 1943 годзе была спалена Ганута. А пасля вайны з часам былі разабраны і сцены палаца разам з некаторымі ацалелымі гаспадарчымі пабудовамі на цэглу. Так маёнтак Ганута быў канчаткова знішчаны. Ганутская сядзіба не захавалася, аб яе вонкавым выглядзе сёння можна меркаваць толькі па захаваўшыхся фотаздымках і вядомай акварэлі 1877 года знакамітага мастака Напалеона Орды. Не захаваўся і сам тапонім Ганута, сёння паселішча называецца Ручыца, па назве суседняй вёскі, а цяпер спалучанай з тэрыторыяй былога маёнтка.



**Свята-Мікалаеўская царква**

Першае ўзгадванне праваслаўнага храма ў мястэчку Вілейка адносіцца да 1567 года, і вядома, што на гэты час царква ўжо дзейнічала. У 1775 годзе на месцы першага храма (зараз плошча Свабоды) з'явілася новая драўляная царква, пабудаваная на сродкі вілейскага старасты Юзэфа Паца. У 1830-я гады ў Вілейцы збудавалі другую праваслаўную царкву, якая была ўзведзена на новай гарадской плошчы. У гэты час павятовы горад Вілейка змяняўся, уздоўж Віліі была разбіта сетка кварталаў – як працяг першых вуліц. Дзве драўляныя царквы – былую ўніяцкую (на сучаснай плошчы Свабоды) і новую Свята-Мікалаеўскую (у межах сучаснага гарадскога парка) – і дзве плошчы з'яднала вялікая Мінска-Дзісненская вуліца – паштовы тракт (зараз вул. Савецкая). Новая царква была драўляная на каменным фундаменце. Як яна выглядала, можна пабачыць на фотаздымку Яна Балзункевіча пачатку 20 стагоддзя, зробленым ўжо Мядзелі.

Калі пабудавалі каменную Марыінскую царкву і перабудавалі былы касцёл у Свята-Георгіеўскую царкву, вілейскі драўляны храм, было вырашана перадаць веруючым у Мядзел, бо там царква сгарэла. Такім чынам драўляны Свята-Мікалаеўскі храм разабралі і перавезлі ў суседні Мядзел, дзе сабралі ў тым жа самым выглядзе. Але ў Расійскім гістарычным архіве не так даўно былі знойдзены тры праекты царквы для Вілейкі 1829 года. Паміж імі і выбіралі, якой павінна была стаць новая праваслаўная царква ў Вілейцы на новай гарадской плошчы. Сярод праекта быў варыянт і каменнага храма, і два варыянты драўлянага на каменным фундаменце. Вось праекты цэркваў, якія маглі быць пабудаваныя ў нашым горадзе.



## Маёнтак Багданава

Калі меркаваць па пахаваннях, маёнтак быў ужо ў канцы 18 стагоддзя. Належыў Свідам.

У 1925 годзе (альбо 1926) частку



маёнтка купіў Шостак, астатняя стала маёмасцю Невядомскіх. Гэта адзіны вядомы выпадак у Беларусі, калі ў адной сядзібы былі два гаспадары, адпаведна мелася два дамы. Стары сядзібны дом Свідаў стаў уласнасцю Невядомскіх. Шостакі пабудавалі новы дом побач, дом назвалі “амерыканка”. Уладальнік маёнтка Мікалай Невядомскі, ленінградскі інжынер, памёр у 1941 годзе і пахаваны побач са Свідамі.

Сядзіба займае роўную, значна нівеляваную тэрасу ракі Пела і нешырокую пойму. Мае добра выражаную кампазіцыйную вось, уздоўж якой па мяжы тэрасы пракладзена доўгая ўязная прысада. Будынак аднапавярховы з двухпавярховым цэнтральным аб’ёмам, двума балконамі і тэрасамі. Новы дом заняў найбольш прыўзнятую частку парку з паўночнага боку асноўнай кампазіцыйнай асі.

Стары сядзібны дом, доўгі (32х12 м), прамакутны ў плане будынак з вялікай шкляной верандай, размяшчаўся ў пойменнай частцы паўднёвага боку ўязной дарогі. Згарэў у вайну. На яго фундаменце пабудаваны новы будынак піянерскага лагера.

Парк невялікай плошчай каля 4 га.

Доўгія гады служыў сядзібай піянерскага лагера. У парку пабудавана 5 жылых карпусоў, жылы дом, сталовая, клуб і дапаможныя збудаванні.



Сучасны выгляд

## НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЯ СПАДЧЫНА

### Малюнкі на шкле

Відавочна, што роспіс на шкле як від народнага мастацтва абумоўлены развіццём шкларобства, а менавіта няспынным удасканаленнем з канца XVIII ст. тэхналогіі прасавання шкла, што спрычынілася да масавай вытворчасці таннага, а, значыць, агульнадаступнага шкла ва ўсёй Еўропе. Найбольш пашыраны роспіс на шкле быў у другой палове XIX - пачатку XX ст., у тым ліку і ў Польшчы сумежнай дзяржаве, чые майстры-рамеснікі паўплывалі на яго пашырэнне на беларускіх землях.

Час найбольшага пашырэння малюнкаў на шкле ў народным побыце, акрэслены пачаткам XX - сярэдзінай XX ст., супадае з незвычайнай увагай да шкла ў архітэктуры і дызайне інтэр'ераў, звязанай з адметнай стылістыкай art-nouveau. Вельмі блізкі да гэтай стылістыкі прыём выкарыстання мятай алюмініевай фольгі, якая хутка і шырока ўвайшла ў карыстанне адразу пасля яе вынаходніцтва ў 1910 г. Гэты прыём быў даволі распаўсюджаны дзякуючы эфекту глыбока-

га прыглушанага свячэння выявы. У Вілейскім краязнаўчым музеі захоўваецца вялікая калекцыя малюнкаў на шкле.





**Легенда пра Вільяну**

**Сылка на відэа:**
**https://www.youtube.com/watch?v=T93DvzqKxcA**





**Маляваныя дываны**

Ў Вілейскім краязнаўчым музеі захоўваецца адна з самых вялікіх калекцый маляваных дываноў, якая налічвае 31 экземпляр.



## ВЫДАТНЫЯ АСОБЫ

### Сяргей Ганчар

Калі ты жывеш у Беларусі
і калі табе тое імпануе,
ты паважаеш сваю Радзіму
то мусіш ганарыцца ёй.
С. Ганчар



Наша Вілейшчына – дзівосны край захаваўшы багатую спадчыну мінулага, а яшчэ – людзі, імёны якіх дайшлі да нас праз стагоддзі і нашы сучаснікі. Менавіта яны ствараюць імідж нашай Бацькаўшчыны. Такім з'яўляўся і наш зямляк, былы дырэктар краязнаўчага музея, галоўны рэдактар раённай газеты '' Шлях перамогі'', выдатны чалавек і краязнаўца – Сяргей Мікалаевіч Ганчар. У нашым горадзе на працягу многіх гадоў рэалізуецца праект ''Незабыўныя імёны Вілейшчыны'', мэтай якога з'яўляецца ўшанаванне памяці заслужаных землякоў і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны нашага краю. Была распрацавана ідэя выданняў, прысвечаных выдатным віляйчанам. Іх талент і поспех натхняюць грамадства, дэманструюць прыклад вернай любві да сваёй малой радзімы і сапраўднага патрыятызму.

Першая кніга ''Сэрцам аддany Вілейшчыне'', прысвечана Сяргею Ганчару, яго жыццёваму і творчаму шляху, станаўленню выдатнай шматграннай асобы.

У вёсцы Рабунь знаходзіцца прыватны музей Сяргея Ганчара ''Музей народнага майстэрства''. Пры ўдзеле Сяргея Мікалаевіча адбылося адкрыццё Віллянінага хутара.

Былі распрацаваны праекты: ''Ноч музеяў''(2010г.), ''ART-Вілейка'', ''Уха-фест''. Прымаў актыўны удзел у стварэнні мемарыяла ''Памяць былых вёсак'', меў дачыненне да фонда ''Крокі'' звязанага з адлюстраваннем падзей Першай сусветнай вайны на Вілейшчыне.І сам таксама шмат рабіў па захаванні памяці аб падзеях гэтай вайны.

У снежні 2020 года перастала біцца сэрца Сяргея Мікалаевіча Ганчара. Гэта аб ім сказаў У.Цануніна:''Аб ім адно сказаць я мушу: Бог забірае да сябе найлепшыя людскія душы''…

### Леў Альпяровіч

На рубеж XIX - XX стст. прыпадае творчасць Льва Абрамавіча Альпяровіча (1874 -1913). Гэты мастак заслугоўвае увагу і важнае значэнне для нашчадкаў мае вывучэнне яго творчасці. Леў Абрамавіч Альпяровіч нарадзіуся 4 снежня 1874 года ў мястэчку Куранец Вілейскага павета Віленскай губерніі ў беднай сям'і Абрама Шаломавіча і Хаі Уравай. Каля 1882 г. сям'я пераехала ў Мінск. У 1890 г.



шаснаццацігадовы юнак паступае ў Віленскую рысавальную школу І.П.Трутнева, дзе ён студыяваў два гады і атрымаў пахвальны ліст і срэбны медаль. найбольш моцнай сярэдняй мастацкай навучальнай установай лічылася Адэская рысавальная школа. З 1892 па

1895 гг. Альпяровіч жыве ў Адэсе. Пасля заканчэння вучобы ён паступае ў Пецярбургскую Імператарскую акадэмію мастацтваў, дзе становіцца вучнем славутага рускага жывапісца І. Л. Рэпіна. Скончыў акадэмію ў 1902 г. У 1913 годзе Альпяровіч памёр не вельмі вядомым мастаком, але ў 1939 г. адбылося яго пасмяротнае адкрыццё. Было знойдзена каля трохсот твораў, адбылася выстава. Многія з гэтых работ загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Да нашых дзён дайшлі 34 творы жывапісца. Захоўваюцца яны у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі, Адэскім мастацкім музеі.

На малой радзіме мастака мала папулярызуецца яго творчасць.



## Эдвард Жалігоўскі

Паэт рэвалюцыйна-дэмакратычнага кірунку, філосаф, грамадскі дзеяч (псеўданім Антоні Сава). Нарадзіўся ў Вілейскім павеце недалёка ад вёскі Карэкаўцы ў 1816 годзе. Дзяцінства правёў у Беларусі. У 1833-1836 гг. вучыўся ў Тартускім універсітэце, быў інтэрніраваны за ўдзел у падрыхтоўцы паўстання пад кіраўніцтвам Ш. Канарскага. У 1842 г. вярнуўся на радзіму. У 1851 г. Эдвард Жалігоўскі Быў сасланы ў Петразаводск, потым у Арэнбург, дзе перапісваўся з Тарасам Шаўчэнкам і прысвяціў яму верш «Да народнага паэта». З 1858 г. у Пецярбургу з І. Агрызкам выдаваў газету «Слова» (1859). З 1860 г. з’ехаў за мяжу. Перапісваўся з А. Герцэным, супрацоўнічаў з польскім рэвалюцыйным друкам. Апошнія гады правёў у Жэневе. У антыпрыгонніцкай «драматычнай фантазіі» ў вершах «Ёрдан» (1846), яе працягу «Зорскім» (урыўкі ў 1858 г. чытаў Шаўчэнку, які ў вершы «Перайманне Эдуарду Саве» выкарыстаў прыведзеную ў «Зорскім» беларускую народную песню «Пасаджу каля хаціны»), антыклерыкальнай паэме «Манахі» (1850), зборніку «Паэзія» і «біяграфічна-этычных» нарысах «Сёння і ўчора» (1858) Эдвард Жалігоўскі з абурэннем пісаў пра галечу беларускіх сялян, сцвярджаў права беларускага народа на сваю літаратуру, станоўча ацаніў «Ідылію» Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Перапісваўся з Арцёмам Вярыгам-Дарэўскім.



СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1.Вайцяхоўская В. Л.А.Альпяровіч і ягоны жывапіс у зборы музея. // Паведамленні Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Вып.2. Мн., 1997

2.Гісторыя беларускага мастацтва. Т. 3. Мн., 1989..

3.Матэрыялы Вілейскага краязнаўчага музея(інтэрв'ю з супрацоўнікам музея Стрэж А.В.)

4.Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Вілейскага раёна. – Мінск: Белта, 2003. – 608-622 с.

5.Сэрцам аддадзены Вілейшчыне. Сяргей Ганчар//Мн., 2022

6.Э.Жалігоўскі[Інтэрнэт-рэсурсы]: https://inlnk.ru/KeRyX1

**ТУРЫСТЫЧНЫ МАРШРУТ ''ПА СЛЯДАХ СТРАЧАНАЙ СПАДЧЫНЫ ВІЛЕЙСКАГА КРАЯ''**




1. **Палац Агінскіх(в. Ганута)**
2. **Свята-Мікалаеўская царква(г.Вілейка)**
3. **Радзіма мастака Л.Альпяровіча(в.Куранец)**
4. **Маёнтак Багданава(в.Багданава)**
5. **Радзіма паэта-дэмакрата Э.Жалігоўскага(в.Карэкаўцы)**
6. **Прыватны музей С.Ганчара(в.Рабунь)**